## ПРАДМОВА

# Заходняя Беларусь у міжваенны час

Сёлета спаўняецца 75 гадоў уваходу Чырвонай Арміі на заходнебеларускія тэрыторыі з наступным уключэннем большасці з іх у склад БССР. У афіцыйнай беларускай публічнай сферы такія даты звычайна застаюцца практычна незаўважанымі, што выглядае нават свядомым і паслядоўным іх ігнараваннем. Адной з прычынаў гэтага можа быць надзвычай супярэчлівы характар не толькі падзей верасня і наступных месяцаў 1939 г., але і самой заходнебеларускай спадчыны.

Заходнебеларуская спадчына — гэта шмат ў чым «нязручнае мінулае». Яно было такім у савецкі час, а з пэўнымі зменамі ды мадыфікацыямі застаецца і цяпер. Натуральна, дзякуючы высілкам акадэмічнай супольнасці, асабліва за апошнія 25 гадоў, было шмат зроблена для лепшага разумення і асэнсавання як міжваеннага перыяду ды вераснёўскіх падзей, так і асаблівасцяў ды месца Заходняй Беларусі ў пасляваеннай БССР. Шмат «белых плямаў», аднак, застаецца і сёння.

Пяць гадоў таму выйшаў тэматычны нумар часопіса «ARCHE», прысвечаны верасню 1939 г. («17 верасня 1939 года: антрапалогія ўз'яднання»). Хоць, за выключэннем вельмі кароткіх аглядаў (як у кіеўскім часопісе «Критика»), ніякіх водгукаў на гэты нумар не было, ужо праз непрацяглы час пасля выхаду яго практычна немагчыма было знайсці ў кнігарнях. Гэта парадаксальным чынам сведчыць пра запатрабаванасць грамадствам тэмаў, звязаных з міжваеннай Заходняй Беларуссю, а таксама жыццём «заходнікаў» падчас і пасля Другой сусветнай вайны.

У гэтым годзе рэдакцыя вырашыла яшчэ раз зрабіць своеасаблівы зрэз стану даследаванняў на тэму Заходняй Беларусі. Тэксты, якія публікуюцца ў гэтым нумары, парадуюць як прафесійную супольнасць даследчыкаў, так і аматараў гісторыі. Цікавымі будуць вынесеныя на суд чытачоў новыя дакументы мінулага, якія дазваляюць крыху інакш паглядзець нават на вядомыя заходнебеларускія рэаліі. Гэта ў першую чаргу сумесны тэкст Аляксандра Быстрыка (дэбют гэтага маладога аўтара ў часопісе) і сталага аўтара выдання гісторыка Андрэя Вашкевіча, прысвечаны праекту аўтаноміі Заходняй Беларусі, распрацаванаму беларускімі нацыянальнымі дзеячамі ў сярэдзіне 1920-х гг. Акрамя таго, пінскі краязнаўца Аляксандр Ільін упершыню публікуе частку ліставання ксяндза Уладзіслава Талочкі (1887—1942) і ўкраінскага публіцыста, паліталага і літаратара, аўтара вядомага твора «Раксалана» Восіпа Назарука (1883—1940), якое перахоўваецца ў адным з архіваў Львова. Эпісталярная спадчына інтэлектуальных лідараў Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны дазваляе паглядзець, як розныя сацыяльныя і культурныя абставіны паўплывалі на рэфлексіі абодвух інтэлектуалаў пра лёсы беларусаў і украінцаў, як узаемнае параўнанне дапамагала ім цвяроза ацэньваць асаблівасці гістарычнай сітуацыі, у якой абодва народы апынуліся паміж дзвюма сусветнымі войнамі.

Таксама інтэлектуальным аспектам нацыянальнага руху прысвечаныя яшчэ два тэксты гэтага нумара: Анастасіі Юркевіч пра дзейнасць Беларускага навуковага таварыства і Аляксандра Пагарэлага пра спадчыну часопіса «25 сакавіка», які выходзіў у 1936—1939 гг.

Лакальнаму вымярэнню нацыянальнага руху прысвечана даследаванне Андрэя Чарнякевіча пра горад Гродна як міжваенны асяродак беларускага нацыянальнага руху. У іншым ключы тэму лакальнасці таксама распрацоўваюць і іншыя аўтары. Калі Леанід Лаўрэш выбраў для вывучэння праблему сацыяльна-эканамічнай гісторыі і сацыяльных канфліктаў на прыкладзе страйкаў у Лідзе ў 1936 г., то тэксты Аляксандра Камінскага і Аляксея Вячоркі, хоць і напісаныя ў больш традыцыйным краязнаўчым рэчышчы, тым не менш даюць уяўленне пра тое, якім жыццём у той час жылі мясцовыя супольнасці, т. зв. «лакальныя светы». Тэкст берасцейскага даследчыка Аляксандра Вабішчэвіча засяроджваецца на дастаткова важнай для кожнага «лакальнага свету» тэме: праблеме догляду за могілкамі на Століншчыне, якая была часткай міжваеннага Палескага ваяводства.

Маладаследаванай тэмай застаецца турызм у міжваеннай Заходняй Беларусі. У сучасных падыходах зазначаецца вялікая важнасць рэкрэатыўнай і спажывецкай сферы ў фарміраванні нацыянальнай ідэнтычнасці і нацыяналістычных пачуццяў, а асабліва краязнаўчых вандровак

і «спазнавання» нацыянальнай тэрыторыі[1]. Заходнебеларускія землі ў Польшчы былі аб’ектам турыстычнага зацікаўлення як з прычыны гістарычнага значэння гэтых тэрыторый у агульнапольскім кантэксце, так і дзякуючы прыродным ландшафтам. Гісторык Алесь Белы сваім невялікім тэкстам толькі адкрывае вельмі ёмістую і шматбаковую тэму даследавання турызму на заходнебеларускіх прасторах міжваеннай Польшчы.

Адным з міжваенных аўтараў, які стварыў прывабны для патэнцыйных польскіх і замежных турыстаў вобраз прыроды Віленшчыны, Навагрaдчыны і Палесся, быў журналіст і пісьменнік Юзаф Мацкевіч (1902—1985)[2]. Месцу Заходняй Беларусі ў яго творчасці прысвечаны тэкст даследчыцы з Торуня Святланы Чэрвоннай. Тэкст гісторыка з Беластока Войцеха Сляшынскага асвятляе ролю кінематографа ў палітыцы саветызацыі і ідэалагічнай індактрынацыі на тэрыторыі Беласточчыны у перыяд з 1939 па 1941 гг.

Польскі гісторык Пётр Ціхарацкі прысвяціў свой артыкул разбору тэмы тэкстуальнага канструявання вобраза палешука ў дыскурсе міжваеннай польскай літаратуры, які, з аднаго боку, легітымізаваў польскую палітыку ў адносінах да Палесся, а з другога — ствараў устойлівы стэрэатып адсталых людзей, якія патрабавалі патэрналісцкага ўмяшальніцтва і апекі з боку польскай дзяржавы і грамадскасці.

Цікавымі для чытачоў будуць і тыя матэрыялы, якія або ў фармаце гістарычнага эсэ, або ў якасці даследчага артыкула раскрываюць паходжанне і агульнае месца феномена Заходняй Беларусі і ўвогуле міжваеннага перыяду. Вядомы польскі гісторык Ежы Тамашэўскі, які шмат сваіх манаграфій і артыкулаў прысвяціў заходнебеларускай тэматыцы, а таксама сучасны беларускі даследчык Анатоль Трафімчык прапануюць увазе чытачоў і крытыкаў свае канцэптуалізацыі Заходняй Беларусі і ацэньваюць значэнне міжваеннага перыяду для беларусаў па заходні бок рыжскай мяжы.

Хочацца спадзявацца, што гэты нумар часопіса паслужыць лепшаму, больш шматпланаваму і крытычнаму асэнсаванню заходнебеларускай праблематыкі.

*Аляксандр Пагарэлы*

[1] Judson P. M. Constructing Nationalities in East Central Europe. Introduction // Constructing Nationalities in East Central Europe / Ed. by P. M. Judson, M. L. Rozenblit. New York—Oxford, 2005. P. 9—10.

[2] Bolecki W. Ptasznik z Wilna. O Józefie Mackiewiczu (Zarys monografizny). Kraków, 2007.